Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

26 верасня 2016 года, № 12 (2159)

АКТУАЛЬНА

Уверх па рэйтынгу

6 верасня брытанскае рэйтынгавае агенцтва Quacquarelli Symonds апублікавала рэйтынг 800 найлепшых універсітэтаў свету, у якім **БДУ значна палепшыў свае пазіцыі, заняўшы 354 месца.** У 2015 г. вядучая ВНУ краіны знаходзілася на 421-430 месцы, у 2014 годзе – на 491-500 пазіцыі.



Такім чынам, БДУ амаль на 70 пазіцый падняўся ў рэйтынгу QS і абышоў усе польскія, украінскія, латвійскія і літоўскія вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Рэйтынг QS грунтуецца на аналізе дадзеных пра ВНУ і апытаннях незалежных экспертаў. Ацэньваюцца такія паказчыкі, як вынікі апытання экспертаў (акадэмічная рэпутацыя) і працадаўцаў, індэкс цытавання навуковых прац за апошнія 5 гадоў, суадносіны колькасці выкладчыкаў і студэнтаў, колькасць замежных студэнтаў і выкладчыкаў і інш.

На вяршыні абноўленага рэйтынгу амерыканскія ВНУ: Масачусецкі тэхналагічны інстытут, Стэнфардскі і Гарвардскі ўніверсітэты.

Вядучыя нацыянальныя ўніверсітэты краін-суседзяў Беларусі: МДУ імя М. В. Ламаносава (108), Казахскі нацыянальны ўніверсітэт імя аль-Фарабі (236), Тартускі ўніверсітэт (347), Варшаўскі ўніверсітэт (366), Кіеўскі нацыянальны ўніверсітэт (431-440), Вільнюскі ўніверсітэт (481-490) і Латвійскі ўніверсітэт (651-700).

Сярод беларускіх ВНУ ў рэйтынгу QS 2016 года прадстаўлены таксама БНТУ (701+).

Увогуле, БДУ паказвае высокія пазіцыі і ў іншых вядомых сусветных рэйтынгах, стабільна трапляючы ў 2 адсоткі найлепшых універсітэтаў свету.

З чым звязаны апошнія міжнародныя поспехі ВНУ, растлумачыў прарэктар па вучэбнай рабоце **Аляксей ТОЛСЦІК:**

– Рэйтынгі QS і THE улічваюць параметр «якасць адукацыі» пры ранжыраванні ВНУ. Ён грунтуецца на водгуках людзей, якія актыўна ўдзельнічаюць у навукова-адукацыйнай, акадэмічнай прасторы – выкладчыкаў-экспертаў, а таксама працадаўцаў. Ім высылаюцца анкеты з пытаннямі, напрыклад: «Якую ВНУ ў той ці іншай краіне вы ведаеце?», «Як ацэньваеце ў ёй якасць выкладання?» і інш. На адказы экспертаў уплывае сусветная рэпутацыя ўніверсітэта. І па гэтым параметры БДУ вельмі выгадна глядзіцца. У нас шмат выпускнікоў, якія працуюць у розных краінах свету. І працадаўцы іх практычныя ўменні ацэньваюць годна. Акрамя таго, наша ВНУ актыўна прырастае замежнымі студэнтамі. Цяпер у БДУ вучыцца больш за дзве тысячы чалавек з 50 краін свету. Яны атрымаюць дыплом, вернуцца на радзіму і стануць там экспертамі, будуць услаўляць альма-матар. Вядомасць – адна з прычын, чаму мы актыўна, скачкамі, набіраем вышыню.

БДУ імкнецца падтрымліваць акадэмічную мабільнасць. Штогод за мяжу выязджае каля тысячы выкладчыкаў і гэтулькі ж студэнтаў па міжнародных абменных праграмах, для ўдзелу ў канферэнцыях.

Важным крытэрыем ацэньвання ВНУ з'яўляецца яе прысутнасць у міжнароднай навукова-публіцыстычнай прасторы. Наколькі актыўна на даследаванні навукоўцаў спасылаюцца ў сваіх працах замежныя калегі. З беларускіх навукоўцаў найбольш цытаваныя тыя, хто працуе ў сумесных міжнародных навуковых кааперацыях, напрыклад, у ЦЕРН – Еўрапейскай арганізацыі па ядзерных даследаваннях.

Менавіта з дапамогай навукоўцаў БДУ адкрыты базон Хігса, імі былі створаны вядомыя супрацьпухлінныя прэпараты, прыборы, распрацаваныя ва ўніверсітэце, працуюць на Міжнароднай касмічнай станцыі і многае іншае.

Ацэньваючы ВНУ па рэйтынгу QS, абавязкова звернуць увагу на суадносіны колькасці студэнтаў і выкладчыкаў. Так, Аляксей Толсцік распавёў, што ў БДУ на аднаго настаўніка даводзіцца шэсць навучэнцаў, а ў астатніх беларускіх ВНУ суадносіны 1 да 10. У замежнай вышэйшай школе такія прапорцыі ўвогуле вызначаюцца спецыяльнасцю. Напрыклад, на 20 гуманітарыяў будзе даводзіцца 1 выкладчык, у той час як суадносіны настаўнікаў і студэнтаў на прыродазнаўчанавуковых ці тэхнічных кірунках – 1 да 2!

Юлія СЕНЬКАВЕЦ

У нумары:

АКАДЭМІК, РЭКТАР, ГРАМАДЗЯНІН
Універсітэцкая супольнасць шчыра віншуе рэктара БДУ Сяргея АБЛАМЕЙКУ з 60-годдзем
Стар. 2

І НЕБА БЫЛО МАЛА І ЗЯМЛІ…
Факультэт радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій справіў 40-гадовы юбілей
Стар. 3

ШКОЛА ПЕРШАКУРСНІКА
Гутарка з дацэнтам Інстытута журналістыкі Ягорам КОНЕВЫМ, які атрымаў Нацыянальную літаратурную прэмію за гістарычную драму
Стар. 4

Весткі з рэктарата

ДАМОВА пра супрацоўніцтва паміж ААТ «Белінвестбанк» і БДУ падпісана 15 верасня старшынёй «Белінвестбанка» Генадзем Сысоевым і рэктарам Сяргеем Абламейкам. Дакумент змацоўвае намер бакоў актыўна ўзаемадзейнічаць у галіне ўдасканалення метадычнага забеспячэння, правядзення навуковых даследаванняў, прапановы адукацыйных паслуг, развіцця матывацыі і падтрымкі таленавітых студэнтаў. Адным з ключавых кірункаў дадзенай дамовы з'яўляецца актуалізацыя зместу навучальных праграм і праграм праходжання практыкі ў адпаведнасці з запатрабаваннямі сучаснай эканомікі. Плануецца таксама праводзіць навукова-практычныя форумы і канферэнцыі, семінары, трэнінгі і майстар-класы па пытаннях практычнага выкарыстання сучасных прылад і тэхналогій банкаўскага бізнесу, арганізоўваць практыку студэнтам БДУ ў «Белінвестбанку» і інш.

* * *

ВЯДОМЫ грамадскі і палітычны дзеяч Расіі Уладзімір Якунін выступіў 14 верасня з лекцыяй па пытаннях устойлівасці палітычных сістэм ва ўмовах развіцця сусветнага крызісу. Уладзімір Іванавіч Якунін – доктар палітычных навук, загадчык кафедры дзяржаўнай палітыкі МДУ імя М. В. Ламаносава, прафесар эканамічнай школы Стакгольма, пасол Расійскай Федэрацыі, заснавальнік Сусветнага грамадскага форуму «Дыялог цывілізацый» («Радоскі форум») – міжнароднай няўрадавай арганізацыі, якая аб'ядноўвае ў адзіную сеткавую супольнасць навукоўцаў, інтэлектуалаў, палітыкаў, бізнесменаў, дзеячаў мастацтва і культуры, якія прадстаўляюць шматстайнасць традыцый, культур і вераванняў з розных краін свету.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

ВЕДАЙ НАШЫХ!

Фенаменальны Ігар Бокій

Галоўным героем Паралімпіяды ў Рыа, якая завяршылася 18 верасня, стаў беларускі плывец **Ігар БОКІЙ,** які заваяваў шэсць залатых і адну бронзавую ўзнагароду. Пры гэтым студэнт юрыдычнага факультэта БДУ ўсталяваў два сусветныя і шэсць паралімпійскіх рэкордаў!

На летніх Паралімпійскіх гульнях беларускі плывец, які выступаў у катэгорыі S13 (для спартсменаў, якія слаба бачаць), стартаваў з усталявання сусветнага рэкорду. У фінале на дыстанцыі 100 м батэрфляем Ігар Бокій паказаў вынік 53,85 сек., абнавіўшы свой жа сусветны рэкорд, паказаны на чэмпіянаце свету–2015 (54,44 сек.). Другім стаў прадстаўнік Узбекістана Кірыл Панкоў – 56,84 сек.

Затым Ігар Бокій выйграў золата на дыстанцыі 200 м комплексным плаваннем, паказаўшы ў фінальным заплыве час 2 хвіліны 4,02 секунды і апярэдзіўшы ўладальніка другога месца ўкраінца Яраслава Дзенісенку амаль на 5 секунд!

Пасля такога ўдарнага пачатку малады плывец троху «расслабіўся» і задаволіўся бронзай у фінале на 100 м брасам.

Затым Ігар Бокій працягнуў каваць метал найвышэйшай спробы. Трэці залаты медаль ён заваяваў у заплыве на дыстанцыі 400 м вольным стылем з вынікам 3 хв. 55,62 сек. Другім да фінішу на гэтай дыстанцыі прыплыў той жа Яраслаў Дзенісенка з адставаннем болей за тры секунды.

У чацвёрты раз наш плывец падняўся на найвышэйшую прыступку п'едэстала пасля фіналу на 50 м вольным стылем. Спрынтарскую дыстанцыю ён праплыў за 23,44 сек. Другое месца заняў Карлас Фарэнберг з Бразіліі з вынікам 24,17 сек.

Пятае золата ў асабістай скарбонцы беларускага паралімпійца апынулася пасля перамогі на дыстанцыі 100 метраў вольным стылем. У фінальным заплыве беларускі спартсмен паказаў час 50,9 секунды, абнавіўшы пры гэтым паралімпійскі рэкорд.

У заключны дзень турніру беларус перамог на дыстанцыі 100 м на спіне. Вынік чэмпіёна – 56,68 сек., што з'яўляецца новым сусветным рэкордам у гэтай дысцыпліне сярод паралімпійцаў. Другое месца заняў Яраслаў Дзенісенка (59,02 сек.), а трэцяе Нікалас Гай Турбідэ з Канады (59,55 сек.).

Гэты залаты медаль стаў шостым для беларускага спартсмена на Гульнях у Рыа-дэ-Жанэйра. Такі вынік дазволіў яму стаць самым тытулаваным атлетам Паралімпіяды. Зараз Ігар Бокій з'яўляецца адзінаццаціразовым паралімпійскім чэмпіёнам. Чатыры гады таму ў Лондане плывец з Бабруйска пяць разоў атрымліваў найвышэйшую ўзнагароду.

Усяго ў скарбонцы беларускай зборнай 10 медалёў (восем залатых і дзве бронзавыя ўзнагароды) і 19 месца ў медальным заліку Паралімпійскіх гульняў.

Віншуем Ігара Бокія з выбітным поспехам!

З НАГОДЫ

Акадэмік, рэктар, грамадзянін

24 верасня рэктару БДУ акадэміку НАН Беларусі Сяргею АБЛАМЕЙКУ споўнілася 60 гадоў, што стала знамянальнай падзеяй для ўсёй універсітэцкай супольнасці. Харызматычны кіраўнік, таленавіты навуковец і выдатны педагог заслужыў сваёй плённай дзейнасцю вялікі аўтарытэт у нашай краіне і ва ўсім свеце.

Да юбілейнай даты выдавецтвам БДУ выпушчана кніга **«С. У. Абламейка: акадэмік, рэктар, грамадзянін»**, у якой прадстаўлены жыццёвы шлях і прафесійныя дасягненні вядомага навукоўца, прыведзены звесткі пра яго шматлікія распрацоўкі, якія спрыялі абнаўленню беларускай навукі. Фрагмент з яе, а таксама віншаванне ад найбліжэйшых паплечнікаў прапануем вашай увазе.

Навуковая ніва

Сяргей Уладзіміравіч справядліва можа лічыцца адным з заснавальнікаў тэхналогій непасрэднай апрацоўкі выяў і распазнавання вобразаў, адным са стваральнікаў беларускіх касмічных спадарожнікаў.

Перадавы навуковец, адважны эксперыментатар і арыгінальны мысляр, каранямі трывала звязаны з беларускай зямлёй, С. У. Абламейка, дзякуючы шырокай эрудыцыі, працавітасці, найглыбейшым ведам, увайшоў у плеяду вядучых навукоўцаў не толькі Рэспублікі Беларусь і СНД, але і сусветнага ўзроўню.

Сяргей Уладзіміравіч скончыў Воранаўскую сярэднюю школу ў Гродзенскай вобласці, атрымаў вышэйшую адукацыю ў БДУ, а ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі прайшоў шлях ад стажора-даследчыка Інстытута тэхнічнай кібернетыкі да генеральнага дырэктара Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі, акадэміка-сакратара аддзялення фізікі і інфарматыкі, узначаліў БДУ.

С. У. Абламейка стаяў ля вытокаў развіцця даследаванняў у галіне апрацоўкі выяў з прыкладаннямі па ідэнтыфікацыі картаграфічнай інфармацыі. У 28 гадоў ён абараніў кандыдацкую дысертацыю, у 34 гады стаў доктарам навук, у 36 – прафесарам. Ім распрацаваны тэхналогіі, метады, праграмнае забеспячэнне для стварэння лічбавых картаў, што дазволіла павялічыць узроўні аўтаматызацыі і дакладнасці, скараціць час аблічбоўвання картаў.

Сяргей Уладзіміравіч першы паказаў поўнае рашэнне задачы аўтаматычнага ўводу і вектарызацыі картаў. Гэта галіна навуковай працы была настолькі спецыфічная, што падобныя даследаванні вяліся толькі ў СССР і ЗША.

Па сутнасці, С. У. Абламейка з'яўляецца адным з першапраходцаў у свеце па апрацоўцы выяў. Ён зрабіў і робіць шмат для таго, каб папулярызаваць айчынную навуку і прадстаўляць яе дасягненні за межамі Беларусі.

На этапах станаўлення С. У. Абламейкі як навукоўца – дзясяткі замежных навуковых камандзіровак, сотні дакладаў і выступленняў на міжнародных канферэнцыях і сімпозіумах. З апублікаваных 500 навуковых прац больш за палову выдадзена ў вядучых міжнародных часопісах на англійскай мове; пад яго аўтарствам выйшла 25 кніг, шматлікія – за мяжой, некаторыя з іх сталі класікай, настольнымі кнігамі цэлага пакалення навукоўцаў. Атрыманыя С. У. Абламейкам фундаментальныя вынікі ляглі ў аснову фарміравання ў Беларусі прызнанай навуковай міжнароднай школы.

Сяргей Уладзіміравіч абраны членам кіраўнічага камітэта Міжнароднай асацыяцыі па распазнаванні вобразаў (IAPR), прызначаны кіраўніком Беларускага цэнтра Брытанскага інстытута інжынераў па электратэхніцы (IEEE), абраны галоўным членам Брытанскага інстытута інжынераў па электратэхніцы (IEEE), членам рэдкалегій шэрагу міжнародных і айчынных часопісаў, ганаровым членам Міжнароднай асацыяцыі па распазнаванні вобразаў (Fellow of IAPR), старшым членам Амерыканскага інстытута па электратэхніцы і электроніцы (IEEE) і г. д.

Пад кіраўніцтвам С. У. Абламейкі распрацаваны тэорыя, метады і алгарытмы апрацоўкі і распазнавання графічнай інфармацыі. Ім сфарміраваны прынцыпы пабудовы і метадалогія стварэння аўтаматызаваных сістэм апрацоўкі вобразаў, распрацаваны шэраг пэўных аўтаматызаваных сістэм і праграмных комплексаў апрацоўкі графічнай інфармацыі з прыкладаннямі ў картаграфіі, даследаванні зямной паверхні, медыцыне, машынабудаванні і прыборабудаванні. Сёння дадзеныя сістэмы ўкаранёныя і працуюць на шматлікіх прадпрыемствах народнай гаспадаркі і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь.

С. У. Абламейка валодае выдатным арганізатарскім талентам. Ён прызначаны намеснікам старшыні Нацыянальнага савета па кос-

масе. Пры яго непасрэдным удзеле распрацоўваліся і рэалізоўваліся самыя адважныя ў прамым сэнсе касмічныя праекты. Сур'ёзнай заявай пра самадастатковасць касмічнай нацыянальнай навукі стала распрацоўка беларускага спадарожніка і арганізацыя па ініцыятыве Сяргея Уладзіміравіча 1 Беларускага касмічнага кангрэса. У далейшым правядзенне гэтага важнага міжнароднага форуму стала пастаянным.

У 2008 г. С. У. Абламейка прызначаны на пасаду рэктара БДУ. Галоўная ВНУ краіны набывае моцнага кіраўніка, які здолеў за кароткі перыяд вывесці БДУ на высокія пазіцыі сусветнай адукацыйнай прасторы. Сёння БДУ ў ліку трох найлепшых ВНУ краін СНД і ўваходзіць у топ-500 універсітэтаў свету. Гэта чарговае пацвярджэнне інтэлектуальнай моцы Беларусі стала магчыма шмат у чым дзякуючы высілкам С. У. Абламейкі па мабілізацыі калектыву.

Сяргей Уладзіміравіч – чалавек шматгранны, багата адораны ад прыроды, рэдкі па душэўнай чысціні, абаяльнасці і заўсёды імкнецца да дасканаласці. Хочацца адзначыць, што ў любым становішчы, у любым грамадстве ён вылучаецца эрудыцыяй, зычлівасцю, бліскучым розумам і цеплынёй унутранага святла. Гэта спадчына ад беларускіх продкаў, набытая ў выніку выхавання, адукацыі і пастаяннай працы.

Чытачы кнігі даведаюцца нямала карыснага і павучальнага з размоў з выдатным чалавекам, навукоўцам сусветнага ўзроўню, бліскучым папулярызатарам і энтузіястам навукі.

У. Я. АГАБЕКАЎ,
акадэмік, заслужаны дзеяч навукі Беларусі

Універсітэцкі плён

Пераважная большасць супрацоўнікаў рэктарата практычна ўсё сваё жыццё аддала служэнню Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту. Мы спадзяёмся, што досыць добра ведаем гісторыю БДУ. І мы можам з упэўненасцю сцвярджаць, што за той адносна кароткі тэрмін, у які акадэміку Сяргею Уладзіміравічу Абламейку давялося ўзначальваць БДУ, ён зрабіў для ўніверсітэта, развіцця навукі і адукацыі ў нашай краіне не менш, чым выбітныя кіраўнікі БДУ – першы рэктар Уладзімір Іванавіч Пічэта і акадэмік Антон Нічыпаравіч Сеўчанка.

Характар такіх кіраўнікоў фарміруюць не толькі неабходныя і рэдка спалучальныя ў адной асобе чалавечыя якасці, прафесіяналізм у працы і навуцы, але і гістарычны адрэзак часу. Пічэта стварaў універсітэт, Сеўчанка аднаўляў яго пасля вайны, а Сяргею Уладзіміравічу Абламейку давялося развіваць alma mater у перыяд станаўлення нашай маладой дзяржавы. Уяўляецца, што прызначэнне С. У. Абламейкі рэктарам у гэты вельмі няпросты перыяд гісторыі нашай краіны і БДУ было вельмі мудрым рашэннем прэзідэнта нашай краіны А. Р. Лукашэнкі па рэкамендацыі А. М. Радзькова і М. У. Мясніковіча. І чаканні дзяржавы і грамадства, як нам уяўляецца, рэктар разам з камандай, якую ён сфарміраваў, апраўдалі ў поўнай меры. Думаецца, што галоўны вынік працы рэктара, рэктарата і ўсёй універсітэцкай супольнасці – тое, што цяпер БДУ, як і Рэспубліку Беларусь, ведаюць і паважаюць ва ўсім свеце.

Рэйтынг БДУ высокі: па апошніх дадзеных агенцтва QS (Вялікабрытанія), БДУ заняў 354 месца ў свеце сярод больш як 32000 універсітэтаў. Такім чынам, ужо амаль выканана задача ўваходжання БДУ ў 1 % найлепшых ВНУ свету. Пад кіраўніцтвам рэктара ўзноўлены магутны навучальна-навукова-вытворчы комплекс БДУ, які дынамічна развіваецца, з унікальнай дзелавой, творчай і чалавечай атмасферай.

Дзякуем Сяргею Уладзіміравічу за тое, што ён сапраўдны рэктар, лідар і чалавек, які патрабавальна ставіцца перш за ўсё да сябе, а потым да атачэння і таму мае маральнае права патрабаваць ад калегаў поўнай самааддачы, чалавек, які пры ўсёй занятасці паказвае прыклад служэння сям'і і сябрам.

Жадаем Вам, Сяргей Уладзіміравіч, каб напарадзе заўсёды была безліч важных і цікавых спраў. Гэта дадае здароўя, і без гэтага Вы не можаце. З юбілеем!

Ад імя рэктарата
А. А. ІВАШКЕВІЧ
акадэмік, першы прарэктар БДУ

Выстава, прымеркаваная да 60-годдзя рэктара БДУ Сяргея Абламейкі, праходзіць у фае рэктарата.

У экспазіцыю ўвайшлі працы Сяргея Абламейкі па пытаннях развіцця інфарматыкі, артыкулы пра адміністрацыйную і педагагічную дзейнасць акадэміка. Прадстаўленыя найбольш цікавыя навуковыя і навукова-папулярныя працы, манаграфіі, падручнікі, энцыклапедычныя публікацыі, тэзісы дакладаў міжнародных канферэнцый і шэраг іншых матэрыялаў, якія выйшлі ў перыяд з 1979 года і да цяперашняга часу.
Выстава будзе працаваць да 5 кастрычніка ўключна.

Фота Яўгена Памыткіна

Сяргей Абламейка разам з прарэктарамі на святкаванні Дня ведаў у БДУ 1 верасня 2016 года

УРАЧЫСТАСЦІ

Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

І неба было мала і зямлі…

Факультэт радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій БДУ адзначыў 40-гадовы юбілей!

Дзве юбілейныя даты адзначылі на факультэце радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій 15 і 16 верасня: 40-годдзе самога факультэта і 55-годдзе падрыхтоўкі радыёфізікаў у БДУ.

Урачыстае пасяджэнне савета факультэта адбылося 15 верасня. У ім прынялі ўдзел рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка, прарэктары, дэканы факультэтаў, студэнты і супрацоўнікі ВНУ. Былі запрошаны прадстаўнікі Міністэрства адукацыі, Вышэйшай атэстацыйнай камісіі, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кіраўнікі вядучых беларускіх прамысловых прадпрыемстваў і навукова-даследчых інстытутаў, з якімі актыўна супрацоўнічае факультэт радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій. На наступны дзень, 16 верасня, у канцэртнай зале «Мінск» прайшоў «Форум радыёфізікаў». На гэтай імпрэзе правялі справаздачна-выбарны сход Беларускага рэспубліканскага грамадскага аб'яднання радыёфізікаў, якое апошнія пятнаццаць гадоў узначальвае прафесар ФРКТ БДУ Сцяпан Мулярчык. Затым адбыўся канцэрт, які падрыхтавалі самі імяніннікі.

Факультэт заснаваны ў 1976 годзе на базе радыёфізічнага аддзялення фізічнага факультэта БДУ. На сёння гэта адзіны ў Беларусі факультэт фізіка-тэхнічнага профілю, спецыяльнасці якога маюць фундаментальную падрыхтоўку ў галіне фізікі, матэматыкі, электронікі, інфарматыкі. Першапачаткова ён называўся факультэт радыёфізікі і электронікі, у 2010 годзе ў сувязі з увядзеннем новых спецыяльнасцяў і спецыялізацый падрыхтоўкі пераназваны ў факультэт радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій.

У наш час на факультэце вядзецца навучанне спецыялістаў па 5 спецыяльнасцях: радыёфізіка, фізічная электроніка, камп'ютарная бяспека, прыкладная інфарматыка і аэракасмічныя радыёэлектронныя тэхналогіі. Акрамя таго, дзейнічае магістратура, аспірантура і дактарантура. У структуру факультэта ўваходзяць 8 кафедраў, 4 навукова-даследчыя і 3 студэнцкія навуковыя лабараторыі, цэнтры аэракасмічнай адукацыі, калектыўнага карыстання нанатэхналогій і фізічнай электронікі.

Навучаецца больш за 1000 студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў і дактарантаў. Калектыў факультэта – гэта каля 200 навуковых, навукова-педагагічных працаўнікоў, навучальна-дапаможны персанал, у тым ліку 1 акадэмік, 1 член-карэспандэнт НАН Беларусі, 18 прафесараў і 65 дацэнтаў.

Факультэт радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій з'яўляецца буйным навучальным, навукова-метадычным і навукова-даследчым цэнтрам фізіка-тэхнічнага профілю. За 40 гадоў факультэт скончыла больш за 7000 высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне тэарэтычнай і прыкладной радыёфізікі, электронікі, інфарматыкі. Аспірантамі і супрацоўнікамі факультэта абаронена 26 доктарскіх і больш за 230 кандыдацкіх дысертацый. Навукоўцы факультэта апублікавалі 40 манаграфій і больш за 3000 навуковых артыкулаў. Супрацоўнікі, студэнты і аспіранты факультэта бралі ўдзел у рэалізацыі найважнейшых навукова-тэхнічных праектаў, уключаючы «Марс», «Венеру», «Буран-Энергію».

Алена МАРЦУЛЕВІЧ

УЛАСНАЯ СПРАВА

Першы крок да раскрыцця прадпрымальніцкага патэнцыялу

У цэнтры развіцця моладзевага прадпрымальніцтва эканамічнага факультэта БДУ прайшлі дні адчыненых дзвярэй школы «Уласная справа». 14 верасня школа распавяла пра сваю дзейнасць вучням агульнаадукацыйных школ, а 15 верасня яе наведалі студэнты ВНУ.

На дзень адчыненых дзвярэй 14 верасня прыехалі больш за 60 вучняў школ і гімназій Мінска, Бараўлян і Маладзечна. Начальнік цэнтра **Любоў Шумская** распавяла, што галоўнай мэтай навучання ва «Уласнай справе» для вучняў школ яны лічаць асобаснае развіццё, а таксама самавызначэнне і прафесійную арыентацыю, выбар будучай прафесіі. Таксама яна заўважыла, што вучні, якія праявілі ініцыятыву і прыйшлі на дзень адчыненых дзвярэй, ужо на крок наперадзе сваіх аднакласнікаў.

У мерапрыемстве таксама прынялі ўдзел і выкладчыкі школы: Віктар Маргелаў, Сяргей і Марына Найдовічы, Зарына Залеская, Канстанцін Жураўскі. Выступоўцы заўважылі, што ў сённяшняй эканамічнай сітуацыі вялікае значэнне мае развіццё малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, для чаго цяпер ствараюцца спрыяльныя ўмовы. Яны адзначылі, што школа «Уласная справа» дае аб'ёмныя веды і ўяўленні пра прадпрымальніцкую дзейнасць і заклікалі вучняў браць веды. Канстанцін Жураўскі звярнуў увагу дзяцей на тое, што выкладчыкі школы – гэта не толькі тэарэтыкі, але і бізнесмены-практыкі і спецыялісты ў розных галінах, а таксама паважаныя людзі з велізарным досведам, якім яны гатовыя падзяліцца.

15 верасня ЦРМП адчыніў свае дзверы для студэнтаў ВНУ. І хоць іх было менш, чым школьнікаў, яны былі настроены досыць сур'ёзна. Распавядаючы пра працу школы, Любоў Шумская адзначыла: «У студэнтаў адбываецца прафесійнае самавызначэнне ўжо ў профілі сваёй будучай прафесійнай дзейнасці, таму ў школе прадпрымальніцтва мы вылучаем і рыхтуем тую страту студэнцкай моладзі, якая сыдзе ў самазанятасць, бізнес, адкрые сваю справу. Студэнты часцяком прыходзяць да нас ужо з ідэяй, а наша задача – паказаць ім спосаб, як ідэя можа ператварыцца ў камерцыйны прадукт і стаць асновай іх прафесійнай дзейнасці».

З гадзінным майстар-класам для прысутных выступіў вядомы беларускі бізнесмен Аляксандр Кныровіч. У нязмушанай атмасферы ён адказаў на пытанні студэнтаў пра якасці добрага прадпрымальніка, тайм-менеджмент, пачатак кар'еры і шмат чаго іншага, а таксама распавёў, у якой форме будуць праходзіць заняткі ў школе «Уласная справа».

Павіталі студэнтаў і заклікалі іх раскрываць свой патэнцыял і іншыя выкладчыкі школы: Марына Рошчына, Канстанцін Жураўскі, Сяргей Драбышэўскі. А вядомы беларускі псіхолаг і сацыёлаг Віктар Шэйнаў прапанаваў усім прайсці тэст для найлепшага разумення саміх сябе.

Са школьнікамі і студэнтамі падзяліліся сваімі ўражаннямі пра вучобу ў школе «Уласная справа» яе выпускнікі Эльдар Гасымаў і Валянцін Дашкевіч. Эльдар Гасымаў распавёў: «Школа «Уласная справа» дапамагла мне развіць неабходныя навыкі і здабыць упэўненасць у сабе, я навучыўся працаваць у камандзе, дамаўляцца. Вучыцца было вельмі цікава, калі шчыра, я на гэта нават не разлічваў. Цяпер прыемна ўсведамляць, што час выдаткаваны нездарма, і атрыманыя веды я выкарыстоўваю кожны дзень».

Заняткі ў школе «Уласная справа» пачынаюцца 8 кастрычніка. Дадатковую інфармацыю вы можаце даведацца па тэл.: 8 (017) 284-00-11; 8(029) 616-88-51, а таксама на сайце *www.bdc.bsu.by* і ў групе «УКантакце» https://vk.com/crmp_bsu.

Дар'я КОЎЗА

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

1 кастрычніка Адамовіч Тадэвуш Іванавіч, дацэнт кафедры тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі

1 кастрычніка Свірыдовіч Марына Васільеўна, дацэнт кафедры прыкладной лінгвістыкі

6 кастрычніка Рудэнка Алена Мікалаеўна, прафесар кафедры тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства

7 кастрычніка Яблонская Наталля Барысаўна, дацэнт кафедры агульнай матэматыкі і інфарматыкі

9 кастрычніка Вараб'ёва Таццяна Мікалаеўна, прафесар кафедры неарганічнай хіміі

11 кастрычніка Шынгель Наталля Адамаўна, дацэнт кафедры эканагічнага і аграрнага права

14 кастрычніка Кузаўкоў Павел Васільевіч, дацэнт кафедры агульнай фізікі

14 кастрычніка Гайдукевіч Леанід Міхайлавіч, загадчык кафедры міжнароднага турызму

17 кастрычніка Кісель Наталля Канстанцінаўна, дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі навукі

25 кастрычніка Макарэвіч Тамара Аляксандраўна, дацэнт кафедры агульнай экалогіі і методыкі выкладання біялогіі

26 кастрычніка Васілеўская Алена Іванаўна, дацэнт кафедры неарганічнай хіміі

29 кастрычніка Мячкоўская Ніна Барысаўна, прафесар кафедры тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства

29 кастрычніка Гаеўская Таццяна Васільеўна, дырэктар НДІ фізіка-хімічных праблем

30 кастрычніка Сірэнка Святлана Мікалаеўна, дацэнт кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі

31 кастрычніка Бабкоў Уладзімір Васільевіч, прафесар кафедры вылічальнай матэматыкі

АБ'ЯВЫ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ тэорыі і метадалогіі журналістыкі,

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: біяфізікі, паліталогіі, тэорыі і метадалогіі журналістыкі, грамадзянскага права, крыміналістыкі,

СТАРШАГА ВЫКЛАДЧЫКА КАФЕДРЫ крыміналістыкі,

ВЫКЛАДЧЫКА КАФЕДРЫ дзяржаўнага кіравання.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.

БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

Святкаванне Дня ведаў у БДУ – БелТА, АНТ, БТ-1, СТБ (01.09).

Новыя поспехі БДУ ў рэйтынгу QS World University Rankings – sputnik.by, Tut.by, БелТА, soyuz.by, sb.by, aif.by, БТ-1, interfax.by, АНТ, СТБ, kv.by, telegraf.by (06.09), profi-forex.by, kp.by (07.09), tvoygorodpskov.ru (08.09), «Звязда» (10.09), «Аргументы і факты» (13.09).

Выстава «Гісторыя станаўлення выбарчага права на беларускіх землях» у БДУ – БелТА, belnovosti.by (01.09), minsknews.by, interfax.by, wuz.by (05.09), 1 Нацыянальны канал Беларускага радыё, радыё «Сталіца», АНТ, СТБ, БТ-1, zviazda.by, kp.by (06.09).

Вядомы грамадскі дзеяч Расіі Уладзімір Якунін выступіў з лекцыяй у БДУ – БелТА, minsknews.by, БТ-1, АНТ, 1 Нацыянальны канал Беларускага радыё, радыё «Сталіца» (14.09).

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

У ВОЛЬНЫ ЧАС

«ПершакурснікFESTival» адгрымеў у БДУ!

Мора весялосці, радасці, усмешак і выдатнага настрою падарыў фэст студэнцкага жыцця БДУ. Па-свойму першы фэст для першакурснікаў прайшоў настолькі выдатна, што нават рэктар Сяргей Уладзіміравіч Абламейка адзначыў:

«БРСМ БДУ стварыў настолькі маштабнае мерапрыемства ў самым сэрцы нашага ўніверсітэта, што на маёй памяці падобнае ўпершыню. Упершыню гэтулькі студэнтаў розных факультэтаў сабралася ва ўнутраным дворыку, упершыню гэтулькі радасці і шчасця на іх тварах, гэта вельмі прыемна і выдатна!»

Праграма фэсту была вельмі насычаная. Кожны студэнт мог паспрабаваць сябе ў спартыўных гульнях, пагуляць у футбол, хакей (хоць і настольны), тэніс, паскакаць на батутах, згуляць з сябрам у гольф, бадмінтон, адпачыць у зялёнай зоне дворыка на яркіх пледах, пачаставацца смачнай ежай і напоямі і – куды без гэтага – сфатаграфавацца ў розных фотазонах, падрыхтаваных арганізатарамі.

Музычнае суправаджэнне «ПершакурснікFESTival» таксама было вельмі пазітыўнае і выдатна дапоўніла фэст. Хэдлайнерам выступіў Дзядзька Ваня! Асобная частка праграмы была адведзена гэтаму шоумену, што вельмі спадабалася нашым студэнтам.

Важнай часткай фэсту стаў «Адкрыты дыялог», які прайшоў у габеленавай зале рэктарата БДУ і аб'яднаў меркаванні адміністрацыі і студэнтаў універсітэта.

І, вядома ж, галоўнай падзеяй стала моладзевая вечарына БРСМ БДУ ў клубе Dozari!

Калі ты не змог пабываць у нас на фэсце, глядзі фота і відэа, а ў наступным годзе прыходзь на «ПершакурснікFESTival» і адчуй на сабе гэту цудоўную атмасферу!

Да сустрэчы ў самым сэрцы ўнівера!

Іван КЛІЧКОЎСКІ
Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

ДАСЯГНЕННІ

Толькі беларушчынай мы будзем цікавыя свету

На Дні беларускага пісьменства ў Рагачове ўзнагароджвалі пераможцаў ІІ Нацыянальнай літаратурнай прэміі. **Найлепшым творам драматургіі прызнана п'еса «Злачынства і пакаранне на берагах Свіслачы» дацэнта кафедры міжнароднай журналістыкі і літаратуры Інстытута журналістыкі Ягора КОНЕВА.** Мы пагутарылі з аўтарам пра прызнанне гістарычнай драмы і яе далейшы лёс.

– Ягор Фёдаравіч, віншуем з узнагародай! Ці было нечаканым для Вас такое прызнанне?

– Яно было дужа прыемным. У апошняй дэкадзе жніўня мне пазваніў старшыня Мінскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Міхась Пазнякоў і запрасіў паехаць разам з дэлегацыяй у Рагачоў на ўручэнне прэмій. Так я і даведаўся, што ўганараваны Нацыянальнай літаратурнай прэміяй у галіне драматургіі. А літаральна за два месяцы да таго ўдзельнічаць у конкурсе мне прапанаваў пісьменнік і драматург Георгій Марчук. Ён узначальвае ў саюзе секцыю драматургіі і таму ўважліва адсочвае, хто з сяброў СПБ штосьці апублікаваў або паставіў за бягучы перыяд. Мая п'еса патрапіла ў поле яго зроку, дык ён ад імя секцыі і вылучыў яе на разгляд камісіі па прысуджэнні прэміі.

– Вы ўдзельнічалі ў конкурсе толькі з драматургічным творам, ці была яшчэ проза? Як Вы ўспрымаеце тое, што Вас адзначылі менавіта як драматурга?

– Нацыянальная прэмія прысуджаецца ў розных намінацыях, у тым ліку ў галіне прозы, літаратуразнаўства, твораў для дзяцей, «дэбют» і г. д. За прозу (раман «Американская адысея Тадэвуша Касцюшкі») я атрымаў прэмію Саюза пісьменнікаў «Залаты купідон» дзесяць гадоў таму... А тое, што адзначылі менавіта як драматурга, то гэтым ганаруся. Я сябе збольшага і ўспрымаю як драматурга. На семінарскіх занятках у Інстытуце журналістыкі, дзе выкладаю ўжо сямнаццаць гадоў, часта бачу такія праявы студэнцкай натуры, што і ў тэатр хадзіць не трэба. Але і ў тэатр хаджу.

– Як узнікла п'еса? Чаму менавіта тэму гістарычнай драмы Вы выбралі для свайго твора?

– Трыццаць гадоў таму патрапіў мне ў рукі раман «Чорны замак Альшанскі» Уладзіміра Караткевіча (гэты пісьменнік, шчыра кажучы, і прыахвоціў мяне да беларушчыны). Другарадным персанажам у рамане быў знакаміты следчы і суддзя Андрэй Станкевіч – «беларускі Шэрлак Холмс сямнаццатага стагоддзя». Дарэчы, рэальная асоба, яго дзейнасць зафіксавана ў судовых актах, што захоўваюцца ў архівах. З тае пары глыбока засеў у маёй памяці гэты персанаж. І паколькі ніхто болей не пісаў пра гэтага дзеяча, то я падумаў: чаму б мне за яго не ўзяцца? А паколькі самым знакамітым злачынствам у часы «залатога спакою» Рэчы Паспалітай было забойства шляхціца Карловіча яго жонкай Марынай Дастаеўскай (прапрабабуляй Фёдара Міхайлавіча Дастаеўскага), то немагчыма было не звесці ў крымінальным паядынку гэтых каларытных персанажаў. Дарэчы, маёнтак Дурынічы, дзе адбылося злачынства, знаходзіўся прыблізна на месцы цяперашняга Палаца Рэспублікі. Ахвяру пахавалі на Кальварыйскіх могілках, а пакаранне злачынцы адбылося там, дзе зараз станцыя метро «Няміга». Барацьба за справядлівае пакаранне Дастаеўскай заняла куды болей часу, чым следства і выкрыццё. Але тое, што законнасць, якая ў пачатку сямнаццатага стагоддзя мела неакрэслены характар, пакрысе ўкаранялася ў рэальнасць, тлумачылася выключнымі высілкамі такіх падзвіжнікаў, як Андрэй Станкевіч. Таму я прысвяціў гэтай постаці не толькі п'есу, але і шэраг апавяданняў, якія былі апублікаваны на старонках тыднёвіка «Літаратура і мастацтва», а таксама дэтэктыўную аповесць, якую сёлета друкуе часопіс «Маладосць».

– Вядома, што на рэспубліканскі конкурс адбіраліся творы, надрукаваныя не раней за 2015 год. У якім выданні была надрукавана Ваша п'еса? Дзе чытачу можна пазнаёміцца з творам?

– На старонках часопіса «Маладосць», а таксама ў зборніку «Сучасная беларуская драматургія».

– Па некалькіх Вашых п'есах ставіліся спектаклі. Магчыма, у хуткім часе ўбачым на сцэне «Злачынства і пакаранне...»?

– Сам вельмі хацеў бы там яе ўбачыць. Ды на ўласны досвед пераканаўся, што кіраўніцтва беларускіх тэатраў збольшага пагарджае беларускай драматургіяй. У гэтым лёгка пераканацца, калі паглядзець на афішы нашых тэатраў і пашукаць там п'есы беларускіх аўтараў. У самым лепшым выпадку яны складаюць меней за чвэрць усіх спектакляў, а ў правінцыі сітуацыя яшчэ горшая.

Разважаць на гэты конт і тлумачыць прычыны такой гаротнай з'явы можна доўга, але я схільны бачыць пазітыўную перспектыву нават у сённяшнім крызісе. Зараз дзяржава выдае датацыі тэатрам, а іх кіраўнікі самі вырашаюць, што будуць ставіць. Зразумела, пыху галоўнага рэжысёра болей пацешыць пастаноўка Бамаршэ або Шэкспіра, чым Марчука або Рудкоўскага. З жывымі аўтарамі трэба працаваць, а мёртвыя класікі не запярэчаць. Аднак цяпер у складаных эканамічных варунках, мяркую, дзяржава павінна фінансаваць толькі пастаноўкі беларускіх аўтараў. А Бамаршэ і Шэкспіра, якія мусяць «зрабіць касу», няхай тэатры ставяць за ўласны кошт. У свой час наша дзяржава дамаглася гучання беларускіх выканаўцаў у беларускім радыёэфіры на 50 % і такім чынам надала стымул для развіцця айчыннай эстрады. Мне падаецца, прыспела пара зрабіць тое ж самае і з беларускім тэатрам. Бо толькі беларушчынай мы і будзем цікавыя свету.

Гутарыла
Наталля КУДРАШОВА

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты –
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам
інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082
ад 21 студзеня 2010 года

26 верасня 2016 года
Падпісана да друку 22.09.2016 г.
Зак. 532. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by